Самапомач

Самаромах

Беларуская Кооперацыйна-Гаспадарчая Часопіс

Год II. | Вільня, Сакавік 1933 г. | № 3(6).


Хай злыдні над намі,
скрыючуць зубамі
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй,
засявай!..

ЯНКА КУПАЛА.



Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'ядданых людзей... самапомаччу

Джордж РЭССЭЛЬ.
(Ірляндзец).



ЗЬМЕСТ № 3 (6).

BIEŁARUSKAJA ABECEDA.
Беларуская абэцэда.

A, a — A, a.	H, h — Г, г.	Ł, ł, — Л, л.	S, š — Ш, ш.
B, b — Б, б.	Ch, ch — Х, х.	M, m — М, м.	T, t — Т, т.
C, c — Ц, ц.	I, i — I, i.	N, n — Н, н.	U, u — У у.
Ć, ć — ЦЬ, ць.	J, j — Й, й.	Ń, ń — НЬ, нь.	Ŭ, ŭ — Ў, ў.
Č, č — Ч, ч.	Ja, ja — Я, я.	O, o — О, о.	V, v — В, в.
D, d, — Д, д.	Je, je — Е, е.	P, p — П, п.	Y, y — Ы, ы.
E, e — Э, э.	Ju, ju — Ю, ю	R, r — Р, р.	Z, z — З, з.
F, f — Ф, ф.	K, k — К, к	S, s — С, с	Ž, ž — Ж, ж.
G, g — Г, г.	L, l — ЛЬ, ль.	Ś, ś — СЬ, сь.	Ź ź — ЗЬ, зь.

UVAHA: Pry niedaručeńni vypisanaj hazety z pošty treba zaraz-ža žadać vyjaśnieńnia n[illegible] tej-ža pošcie. I tolki ŭ razie, kali-b heta nie pamahło, treba zaraz-ža ab usioj spravie na[illegible] u administracyju „Samapomačy“. Padać pry hetym treba: kali (dakładna padać dat[illegible]) na jakoj pošcie i jakoha numaru časopisi nia možna było atrymać. Biaz [illegible] zamienny numar „Samapomačy“ vysyłacca nia budzie.

Administracy[illegible]

Samapomač

BIEŁARUSKAJA KOOPERATYŬNA - HASPADARČAJA ČASOPIŚ.

Adres:
VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 4—10.

Самапомач

| Hod II | Vilnia, Sakavik 1933 h. | Nr 4 (6). |

VYCHODŽMA Z ZAČARAVANAHA KRUHU!

Haspadarčaje žyćcio maje toje miž inšym padabienstva da žyćcia biolohičnaha (źviarynna raścinnaha), što pływie roŭna, biez chvalavańniaŭ, tady tolki, kali jaho nia točyć rabak chvaroby. Bolšaść zabureńniaŭ u arhaniźmie biolohičnym prajaŭlajecca skakańniem harački, zabureńni-ž u žyćci haspadarčym prajaŭlajucca ŭ skakańni cenaŭ. I haračka i ceny źjaŭlajucca najčaściejšymi pakazčykami zdaroŭja ci chvaroby svaich arhanizmaŭ. — Nie ŭvachodziačy tut u istotu chvalavańniaŭ arhanizmu biolohičnaha (haračka), na chvilinku choć-by varta pryhledzicca da chvalavańniaŭ žyćcia haspadarčaha (ceny), kab paŭziracca, hdzie znachodziacca pryčyny hetaha chvalavańnia, ci samo jano dla arhanizmu haspadarčaha jošč karysnym, ci nia možna jaho niejak abmiežyć i jakimi šlachami treba da hetaha jści? — Razvažajmo pa paradku.

Kali tolki končyłasia suśvietnaja vajna, i na ŭsiakija pradukty ci to fabryčnaj, ci ziemlarobskaj vytvorčaści byŭ hoład, — usio apłačvałasia vyrablać, bo byŭ zbyt. Udaskanaleny sposab vytvorčaści (mašyny) adnak chutka pačaŭ pierasyčać rynki „da adkazu". U sielska-haspadarčaj vytvorčaści pieršaj achviaraj było zbožža, cana na jakoje pačała raptoŭna padać. Kinulisia tady ludzi da žyviołahadoŭli — na miasa, na małako. Ale i tut chutka nastupiła pierasyčanaść, a ŭśled za hetym i spadak cenaŭ. Dumałasia nie adnamu, što spadak cenaŭ jošč vynikam nadpradukcyi i dziela taho jak u zbažžovaj, tak i ŭ žyviołahadaŭlanaj pradukcyi niepasrednym naśledkam pierasyčanaści rynku było ahraničeńnie samoj pradukcyi.

Bližejšaje adnak zacikaŭleńnie hetaj spravaj pakazała, što vina tut nie ŭ nadpradukcyi — naš kraj u sielska-haspadarskim kirunku asabliva dahetul nia byŭ tryvała navat samavystarčalnym, — a ŭ niesarhanizavańni dzikoha da apošnich dzion rynku. Najlepšym prykładam hetaha jošč los tydni dva tamu ažy viŭšahasia rynku na miasnych śviniej. Ceny skočyli značna ŭvierch. Sialanie i pierakupščyki rynulisia na rynak, chto z čym moh: rynak zapłaviŭsia i ceny ŭznoŭ apali.—Hetak dziejełasia i dziejecca niaŭpynna dahetul i hetak budzie ŭkruh dziejecca da taje pary, pokul na rynku niama stałaj arhanizavanaj suviazi pamiž vytvorcam i spažyŭcom, a jošč tolki sutyčnaść dzikaja, ad vypadku da vypadku.

Jak inakš pradstaŭlałasia-b usia heta sprava, kali-b na rynku byŭ adzin tolki kupiec i adzin pradaviec?! Tady ceny vytvaralisia-b u zaležnaści nie ad vypadkovaha zvozu ci zhonu praduktaŭ-tavaru na rynak, ale ad sapraŭdnaj vartaści hetych praduktaŭ i ad arhanizacyjnaj zdyscyplinavanaści samych vytvorcaŭ. Dokazam hetaha jošč rascenka praduktaŭ vytvorčaści fabryčnaj.

Ale ci heta mahčyma ŭ haspadarcy ziemlarobskaj, dzie vytvorcy hetak raściarušany i hdzie ich nie dziesiatki, ale tysiačy i miljony? Ci mahčyma hetak zrabić, kab z adnej starany vytvorca viedaŭ, kolki i jakich tavaraŭ jon moža pradać, kab nia tracicca na vyrab tavaraŭ lišnich, na katoryja nia možna budzie znajšci kupca, a z druhoha boku, kab i spažyviec mieŭ peŭnaść, što dastanie ŭčas i dobry tavar i nikoli pry hetym nia budzie ašukanym? Ci ŭsio heta mahčyma?

My siahońnia ŭ tym ščaślivym pałažeńni, što nie patrabujučy ŭžo bić hałavoj ab ścianu, možam śmieła i prosta skazać, što hetki ład mahčymy i jaho kulturnyja narody ŭ siabie ŭžo zaviali. Najbolšyja badaj postupy ŭ hetym kirunku zrabili finny i ŭsie skandynaŭcy. Za imi jduć usie inšyja kulturnyja narody i tudoju daroha i dla nas-biełarusaŭ.

Padsumoŭvujučy ŭsio heta možam i musim adkazać na pastaŭlenyja sabie napiera dzie pytańni, što:

1. pryčyna haspadarčaha chvalavańnia ležyć nia hetulki ŭ nadpradukcyi, kolki ŭ „dzikaści" rynku, dzie nichto nia viedaje, čaho i kolki moža pradać, a tymsamym i vyrablać i što kupić;

2. hetkaje chvalavańnie dla haspadarčaha žyćcia vielmi škodnaje i

3. jaho treba abmiežavać pry pomačy arhanizavanaj jak pradukcyi (vyrabu), tak i spažyćcia. — I adno i druhoje, za prykładam kulturnych narodaŭ, možna i treba rabić pry pomačy kooperatyŭnych arhanizacyjaŭ. Tady tolki na rynku budzie adzin pradaviec (producent) i adzin kupiec (spažyviec), tady nia budzie dzikoha i chvarablivaha skakańnia cenaŭ, tady ŭ kramach nia stanie ździrstva, a nia raz i zvyčajnaha ašukanstva, i tady tolki vytvorčaść budzie mieć zapeŭnieny zbyt. A ŭsiaho hetaha jakraz i treba siahońnia našamu biełaruskamu jak spažyŭcu, tak i producentu.

Dyk niezačym užłatać pad abłoki, pakul na ziamli poŭna hetulki i hetak važnaj, choć drobnaj i ciažkaj, ale kaniešnaj pracy!

ČAHO NAM TREBA.

Vierš Janki Kupały
(Naśladavańnie).

Treba nam, treba pierš-najpierš chleba,
Chleba kab stała na celeńki hod,
Droŭcaŭ palena, konikam siena,
Kapiejku jakuju sabie na zvarot.
Treba nam, treba, jak łaski z nieba,
Lepšy, daŭžejšy ziamielki šnurok,
Sytaj skacinki, novaj chacinki,
Kab krasavaŭsia pry chatcy sadok,
Na śviata — skvarku, časam i čarku,
Bułki i syra haściej častavać,
Cely adzietak, knižak dla dzietak;
Treba nam škoły pa vioskach staŭlać,
Roŭnaj darohi, botaŭ na nohi,
Multanu žoncy na lepšy kaptan;
Žyć śmieła ŭ chatcy, i nie bajacca,
Kab nie haniali u vołaść, u stan,
Dochtara treba, špital nam treba,
Darma lačylisia-b dzie biedaki,
Z torbaj-ž na staraść kab nie ciahacca,
Treba ustroić prytułak taki.
Oj mnoha, mnoha dla vioski ubohaj
Treba ŭčynici, kab dobra žyła, —
Nia płakać tolki, nia ranić bolki,
Bolki, jakija niadola dała.
Pry łascy Božaj usio my zmožam,
Hora zatopčam silnaj nahoj,
Zmožam niadolu, zmožam niavolu,
Śvietač zapalim ščaścia svajho!

Volnaja Trybuna.

Nia možna čakać!

Źmiaščajem dalšyja dumki ŭ spravie zakranutaj u apošnim numary „Samapomačy“. Dumki hetyja, u asnovie svajoj, zhadžajucca z papiarednimi, za vyniatkam čarhovaści ŭ planie pracy, vykazanym u apošnim abzacy: „kožny kryčyć, što jamu balić“ Dalšyja hałasy ŭ hetaj-ža spravie vielmi pažadanyja — pišecie!

Musim pry hetym adciemić, što „Hrupa Navahradčan“ nie ahraničyłasia samymi tolki słavami, ale adnačasna prysłała ŭ red. „Samapomačy“ na „Kooperatyŭny Fond“ pieršuju składku ŭ sumie 50 zł. Kvitujem hety krok z pryznańniem i spadziejemsia, što znojdzie jon hodnych siabie paśladoŭnikaŭ.

Red.

Nia možna čakać! Nia možna čakać, nia možna siadzieć składšy ruki, kali kryzys što dalej to bolš šaleje, kali staryja formy haspadarčaha žyćcia vačavidki vykazvajuć svajo bankructva, kali prabiła ŭžo dvanaccataja hadzina.

Z słušnaściu dumak, vyniesienych u artykule „Naša zadača“ na Volnuju Trybunu „Samapomačy“ (Nr. 2(5), luty 1933 hodu) całkom treba pahadzicca. Usialakija oryjentacyi, małyja i bolšyja i zusim maleńkija, daviali bieła-

---

Žiaśniejuć nočy, vysachnuć vočy,
Žlityja horkaj biadnoty ślaźmi;
Hoład zahinie, biadu pakinie!
Dolu mieć budziem, — ej! budziem ludźmi!

Я. Косаўскі.

(6)

Для бліжніх.

Драма ў 4-ох дзеях.
(*З украінскай на беларускую мову тлумачыла Г. Ш.*)

ДЗЕЯ IV.

(*Садок. З боку хата. Пад хатай лаўка. На лаўцы сядзіць Марыся*).

ЗЬЯВА 1.

Марыся (*пастарэла; сумна*): Ой, Божа, Божа! Гэткі прыгожы дзянёк, гэтак прыгожа сонейка сьвеціць, так весела на сьвеце, а маё беднае дзіцё вун там (*паказвае галавою на хату*) мучыцца. Сыночак мой, сыночак!... І што ты каму зрабіў, што цябе так людзі спаняверылі. Ты толькі ім дабра хацеў, а яны цябе пазбавілі здароўя. Ох, калі-б я знала, ад чаго ты папепшаеш, на край-бы сьвету пайшла, душу сваю аддала-б... Але, дзе ўжо тых шукаць лекаў! Дохтар сказаў: «тут — кажа — хіба яго моладасьць памо-жа, бо лекаў на гэта няма». О, гора-ж маё! Завяў мой хлапец, як на марозе кветка. Дзе-ж у яго ўзяць тэй сілы, каб перамагчы цяжкое недамаганьне?!

ЗЬЯВА 2.

Рыгор (*уваходзе, гавора пацiху*): Сьпіць?

Марыся (*патакуе*): Сьпіць. Як заснуў яшчэ з вечара, то дагэтуль не прачхнуўся. Ужо цэлы тыдзень вось так: усё сьпіць і сьпіць. Я ўжо баюся, можа гэта й дрэнна... Ану-ж так калісь засьне...

Рыгор: Ня думаю, цётка. Мне здаецца, што гэты сон яму варочае сілы. Яшчэ калі-б пачуў смак у ядзе.

Марыся (*махнула рукой*): Дзе там. А вось стаіць расол з кураціны — ані пакаштаваў. Учора толькі трохі выпіў гарбаты і ўсяго.

Рыгор: А калі б, цётка, яго на двор вынесьці. Вось як калісь мы тут зрабілі.

Марыся: Калі-ж пасьля надта быў аслаблены. „Мама — кажа — мне нешта галава круціцца, як п'янаму“. І гарачку дастаў большую. А брэдзіў-жа ў гарачцы, што аж было страшна. Усё толькі Насьця, ты ды коопэратыва. „Сынку — кажу яму — ня бойся, усё будзе добра“. А ён усёроўна: „Я нявінен, дальбог нявінен. Я ня ўкраў. Настачка, ты мне ня верыш? І ты, Рыгорка, таксама?! Ой, Божа, Божа...“ Я яго ўспакайваю, а ён увесь час толькі аб гэтым.

Рыгор (*сумна*): Уелася яму крыўда ў душу і не дае супакою. Вы яго, цётка, пры-

ruskaje hramadzianstva da poŭnaje dezoryjentacyi. Narod zhubiŭ vieru ŭ svaje siły, nia vieryć ni samomu sabie, ni druhim. Tvorčyja siły narodu lažać i dremluć adłoham. Biazradnyja staim my pierad kryzysam, raŭnadušna pazirajučy, jak hinuć najbolš zdarovyja sialanskija haspadarki, jak pražyvajecca apošni kapitał, jak šyjem sami sabie i svaim dzieciam žabračuju torbu.

Hdzie-ž vychad? My taksama pierakanany, što vychad z henaha pałažeńnia, adziny i niaŭchilny, znachodzicca ŭ kooperatyŭnym ładzie haspadarčaha žyćcia. Tamu my horača vitajem dumku ab nieabchodnaści jak najchutčejšaha zapačatkavańnia planovaje, scentralizavanaje kooperatyŭnaje akcyi. Pačać hetuju akcyju, viedama, budzie nialohka ciapier: kryzys, biezhrašoŭje. Ale historyja vučyć, što takija momanty, jaki ŭ sučasnaści pieražyvajem, źjaŭlajucca adnačasna najadpaviadniejšymi. Biada ŭsich biaz vyniatku ciśnie, usie šukajuć sposabu žyć, usie najbolš zdolny da arhanizacyi.

Papiarednija, raspylenyja, časta-husta niaŭdałyja sproby zakładańnia kooperatyvaŭ nie pavinny nas spyniać. Zakładanyja ŭrazdrob, stychijna, biez nieabchodnych pajevych kapitałaŭ, biaz ideovaha paviazańnia i biez patrebnaje viery, da taho — u epochu šalonaha spadku marki, — kooperatyvy henyja jak chutka paŭstavali, tak borzda i łopalisia, pakidajučy ŭ narodzie ab sabie niadobruju pamiać i niaprychilnaść da ŭsialakaje kooperacyi.

U astatnija časy „kazionnaja" kultura vytvorčaje kooperacyi (małačarniaŭ) jašče bolš adbiła achvotu da ŭsiakaje kooperatyŭnaje dziejnaści.

Ci-ž padkapała henaja niaŭdałaja praktyka značeńnie kooperacyi i jaje rolu? Zusim nie! Praktyka henaja dakazała tolki, što sprava pačynałasia rabicca nie z taho kanca. U našych umovach moža raźvivacca jana tolki pry varunku planovaha, umieckaha i centralnaha kiraviectva. Tamu dumku aŭtora artykułu „Naša zadača" ab stvareńni kapitału i abniaćci kiraŭnictva ŭ vadnym vorhanie, naležyć pryniać biaz usiakich zaściarohaŭ.

Pry ździejśnivańni planu ŭ pieršuju čarhu treba raźvić enerhičnuju akcyju źbirańnia kooperatyŭnaha kapitału. Heta jość najhałaŭniejšaja zadača, jakaja staić pierad nami. Nia lohkaja jana, ale i nie nievykanalnaja. U našych varunkach adzinaja daroha dla stvareńnia kooperatyŭnaha kapitału — heta masavaje pamiaščeńnie svaich maleńkich i najmienšych choć-by aščadnaściaŭ u adnym supolnym kooperatyŭnym fondzie, jakomu lepiej dać nazoŭ „kooperatyŭnaha abarotnaha kapitału". Nazoŭ „żalezny kooperatyŭny kapitał" navodzić na dumku, što kapitał hety nia moža być skiravany na zakładańnie novych kooperatyvaŭ ci na padtrymańnie žyćciazdolnych isnujučych, da tej pary, pakul nia budzie sabrany peŭny, napierad akreśleny lik hrašej (10 mil. zł., pavodle prajektu aŭtora „Našaje Zadačy").

Voś-ža, čakańnie henaha času nie adpaviadała-b našamu imknieńniu baraćby z kryzysam siańnia, zaraz, zaciahnuła-b spravu na doŭhi čas i ŭreščie źnieachvociła b ludziej, nia

---

водзьце да памяці, а то без патрэбы мучыцца, бедны.

Марыся: Ужо ад трох дзён ня брэдзе. Толькі што вельмі сонны, а як прачхнецца, дык зараз-жа пытаецца пра вас. „Дзе Насьця? Чаму ня прыйдзе? А Рыгорка? Паклічце, мама, Рыгорку!"

Рыгор: Усё ж кліча? Дык тады зараз і пасылайце па мяне.

Марыся: Ды я й пасылаю, толькі не заўсёды ты бываеш дома. А знаеш, ён ня толькі хлапоціцца аб вас, але й аб сваім ворагу. Можа — кажа — ён паправіцца па кары.

Рыгор: Ды ён усіх любіў, толькі яму зрабілі крыўду. Ужо ня дзіўлюся гэным цёмным сілам, каторым ён стаяў на перашкодзе, але некаторыя прыяцелі й тыя былі адвярнуўшыся ад яго. Цяпер каюцца, але што з таго.

Марыся. О, ніколі не забудуся, як тады раніцай амаль ня ўся вёска сабралася пад коопэратыву: „Аляксей злодзей, Аляксей нас падмануў!" Лепш-бы я хацела, каб пада мною зямля расступілася, як слухаць такую зьнявагу свайго дзіцяці. А ён?! Стаяў белы, як крэйда, вочы загарэліся і толькі трօсься,. быццам у трасцы.

Рыгор. Мы з Насьцяй заўсёды верылі ў яго нявіннасьць. А той Ілько, што тады вартаваў, такі выказаў. Сумленьне яго кранула.

Марыся: Ах, як я тады цешылася, як мой Янка прыбег ды крыкнуў: „Мама!—кажа, Аляксей прыехаў!" Я выбегла — гляджу, а яго зносяць з возу. Такі бедны, такі скрыўджаны... (*Плача*).

ЗЬЯВА 3.

Насьця (*ўваходзе*): І ты тут, Рыгорка?! Сьпіць?

Марыся: Сьпіць.

Насьця (*хоча ўвайсьці ў хату*): Пайду пагляджу, як яму.

Рыгор: Настачка, ня йдзі. Яшчэ пабудзіш. Няхай сьпіць.

Насьця (*становіцца каля сьцяны, плача і выцірае хустачкай вочы*).

Марыся: Ня плач, Настачка. Ужо досіць ты наплакалася, бедная.

Насьця: Ох, як мне, цётачка, ня плакаць. Прыйду — пагляджу на яго: ніякай паправы.

Рыгор: А я кажу, што ёсьць паправа, Вы, жанчыны, заўсяды горшае бачыце. Пабачыце, што Аляксей паправіцца і яшчэ так на яго вясельлі (*моргае да Насьці*) патанцуем, што аж зямля будзе стагнаць.

pryvodziačy da nijakaha rezultatu. Sabranaja suma i 10 i navat 5 tysiačaŭ złotych pavinna być užyta prynamsia na padtrymańnie žyćciazdolnaje, asabliva vytvorčaje kooperacyi, pry adnačasnym niaspyniańni nahramadžeńnia novych kapitałaŭ.

Aščadnaści pavinny być, zusim słušna, składany na doŭhi termin (10—12 hadoŭ) i pavinny być biespracentovyja. Pamahajučy ŭ biadzie susied susiedu, my nie biarom anijakich pracentaŭ. Biada našaja ahulnaja, a idejaj kooperacyi jość pamahać usim nam, i tamu nia budzie žadnaje niespraviadlivaści, kali nia budziem haniacca za asabistymi zyskami. U staražytnaści i ŭ siaredniavieččy nie bankir, pryjmajučy hrošy na schoŭ, płaciŭ układčyku pracenty, a sam układčyk płaciŭ bankiru za pierachavańnie hetych hrošaj. Tolki kapitalizm, z jaho istotnaju i nieaddzielnaju padstavaju — šyrokim raźvićciom kredytu, — uvioŭ prybyl na zaaščadžany kapitał. Kooperacyja jość poŭnym prociŭstaŭleńniem kapitalizmu i nie pavinna jści pa jaho śladoch.

Ale vorhan, jaki kiravacimie abarotnym kooperatyŭnym kapitałam, musić brać pracenty, mahčyma najmienšyja ad kooperatyvaŭ, na raschody, źviazanyja z kiraviectvam, i dla zabiaśpiečańnia aščadnaściaŭ. Prybyl hetaja pajšła-b na sapraŭdny „žalezny kapitał", jaki ŭ kancy terminu aščadnaści raŭniaŭsia b pazyčanaj u abarotny kapitał sumie. Hetkim čynam abarotny kapitał stupianiova zvolniŭsia b ad svaich zabaviazańniaŭ da ŭkładčykaŭ, zrabiŭsia-b ułasnym abarotnym kapitałam kooperacyi i zabiaśpiečyvaŭ by stałaść kooperatyŭnaj dziejnaści. Dla kiraviectva kapitałami henymi pavinien być apracavany rehulamin.

Spravu źbirańnia abarotnaha kooperatyŭnaha kapitału na pačatak treba skoncentravać kala redakcyi „Samapomačy", jak ideovaj placoŭki, ahornienaj ducham kooperatyŭnym. Dla šyrejšaje hramadzkaje padstavy možna redakcyi dać prava kooptacyi adpaviedna nastrojenych i padhatavanych dla hetaje pracy ludziej, ale nia ŭ vielmi vialikim liku (5—7 čał.).

Nieadkładna treba raspačać šyrokuju akcyju ŭśviedamleńnia mas. Treba pamiatać, što hrošy źbiarom tolki tady, kali daść choć mała, ale kožny. U chvilinu kryzysu ŭsie siły narodnyja pavinny być skiravany na haspadarčy, u nas—kooperatyŭny front. Usie kulturna-aśvietnyja placoŭki, presa, paasobnyja adzinki musiać zrazumieć, što heta sprava najpilniejšaja i najvažniejšaja. I adrazu ž treba prystupić da składańnia aščadnaściaŭ. – Sprava padhatoŭki adpaviednaha kooperatyŭnaha personału — vielmi važnaja, niama sumnivu! — zrobicca chutčej i lahčej, jak buduć hrošy na praktyčnaje ździejśnieńnie kooperatyŭnaha planu.

Nareščie, pa miery składańnia abarotnaha kooperatyŭnaha kapitału, u pieršuju čarhu treba źviarnuć uvahu na padtrymańnie isnujučaje i stvareńnie novaje vytvorčaje kooperacyi. Spažyvieckaja kooperacyja prydzie sama saboju i lahčej paśla sarhanizavańnia kooperacyi vytvorčaje.

Nia možna čakać! Da pracy!

Hrupa Navahradčan.

Насьця (*жыва*): Рыгорка, ты верыш у гэта?... Ці можа толькі пацешыць хочаш?!

Рыгор: Веру, дальбог, веру! Думаеш, Насьця, што толькі цябе і цётку хачу пацешыць?! А я то што? Хіба-ж ня былі мы найшчырэйшымі прыяцелямі, шчырымі братамі. З маладых гадоў усё разам і разам. Кожны дзень, кожную гадзіну мае думкі каля яго.

ЗЬЯВА 4.

(*За сцэнай гоман. Уваходзяць сяляне тры, ці чатыры. Між імі Радзюк*).

Радзюк (*падходзе першы*): Як маецеся?

Марыся: Дзякую, нічога, як вы?

Радзюк (*паказывае на рэшту сялян*): Прыйшлі да вашага Аляксея.

Марыся (*зьдзівіўшыся*): Да Аляксея?! Чаго?...

I Селянін (*нясьмела*): Мы прыйшлі (*жнецца*), мы хацелі-б перагаварыць (*заікаецца*), як-бы тут сказаць...

Радзюк (*перабівае*): Ды што тут шмат гаварыць: прыйшлі перапрасіць яго ад імя коопэратывы.

II Селянін: А-га, а-га...

I Селянін: Ды нібы гэтак.

Марыся (*усьцешыўшыся*): Настачка, Рыгорка — чуеце?! Вось будзе радасьць для Аляксея, як прачхнецца. (*Да сялян*): Ён яшчэ сьпіць, а я... (*да Рыгора*): Можа-б пабудзіць?!

Рыгор: Не, цётка. Ня трэба. Няхай сьпіць. Гэта можна зрабіць другім разам.

Радзюк: I я думаю. Няхай сьпіць. Яму сон больш патрэбны, як мы. Але вы, Марыся, перадайце яму нашы словы.

Марыся: Перадам, перадам, як толькі прачхнецца.

Аляксей (*з сяней прарываным голасам*): Ня трэба перадаваць, бо я ўсе чуў.

Марыся, Насьця і Рыгор (*кідаючца ў сені*): Аляксей!

Аляксей (*зьяўляецца ў дзьвярох хаты, падтрымліваны маткай і Рыгорам. Насьця з заду, усьміхнуўшыся*): Дзякую вам.. грамадзяне... Дзякую... за ваша да мяне спачуваньне. (*да маткі*): Вось тут, мама, я сабе сяду... на лаўку.

Марыся: Ой, сыночак, чаго-ж ты ўстаў, ды яшчэ сам. Ты-ж такі яшчэ слабы...

Аляксей (*з трудам гавора*): Хочацца, мама, на сьвет, між людзей... Гэткі прыгожы дзень... чую галасы... а тут душна ў хаце... (*да сялян*): I добра, што ўстаў. Вашыя словы найлепшае для мяне лякарства. Я чую, як мне вось тут (*паказвае на грудзі*) лягчэе, як выпагаджваецца маё неба...

I селянін (*стары, з сівымі вусамі*): Аляксей, сынок! Мы прыйшлі да цябе, каб

Praca ŭ niamieckich spaž. kooperatyvach. (4)

Aščadnaściovy ruch. Što najbolš cikavaje i charakternaje dla niamieckaj spažyvieckaj kooperacyi — dyk heta sposab źbirańnia i vykarystoŭvańnia aščadnaściaŭ.

Ahramadnaje raźvićcio hetaha ruchu možna vytłumačyć vysokaj śviadomaściu siabroŭ niamieckich kooperatyvaŭ, katoryja navat samyja drobnyja aščadnaści niasuć u kooperatyŭnuju kasu. U vyniku hetaha źbirajucca vialikija kapitały. Hetak napr. na 1 studzienia 1928 h. ahulnaja suma aščadnaściovych układaŭ u spažyvieckich kooperatyvach Hamburskaha rajonu asiahnuła 207 miljonaŭ marak, pieravysiŭšy sumu pajavoha kapitału ŭ 5 razoŭ. U 1927 h. siaredni hadavy nabor pajščykaŭ sastaŭlaŭ 335 marak, a aščadnaściovych układaŭ na kožnaha pajščyka naličvałasia 70,8 marak.

Vaładańnie bujnymi ŭkładnymi kapitałami pazvalaje niamieckaj spažyvieckaj kooperacyi rabić zakupy tavaraŭ na hatoŭku i hetym samym uniezaležnicca ad pryvatnych kredytaŭ. Dla nas cikavym budzie, peŭniež, zaznajamleńnie z sposabami, jakimi niamieckim kooperataram udałosia škiravać u kooperatyŭnyja kasy drobnyja aščadnaści.

Uva mnohich kooperatyvach, akramia zvyčajnaha pryjomu aščadnaściaŭ u kramach, praktykujecca zbor aščadnaściovych układaŭ pa chatach. Robić heta kooperatyŭny aktyŭ, siabry katoraha abchodziać usich pajščykaŭ paśla atrymańnia imi zarabotnaj płaty. U inšych rajonach z dobrym vynikam stasujucca specyjalnyja aščadnaściovyja knižki. Akramia taho ŭsie pajščyki kooperatyvy atrymlivajuć žaleznyja „kapiłki“ (skarbonki), kluč ad katorych astajecca ŭ zahadčyka kramy. Kožny lišni hroš kidajecca ŭ hetu „kapiłku“, a potym jana zanosicca ŭ kooperatyvu, dzie jaje adčyniajuć, pieraličvajuć hrošy i zapisvajuć ich na rachunak układčyka.

Hetaki sposab zaviecca „chatniaju aščadnaściovaju kasaju“ i źjaŭlajecca ahulna raspaŭsiudžanym, asabliva sierod žančyn i dziaciej.

Miž inšym pa hetaj systemie pačali źbirać układy i niekatoryja ŭkrainskija kooperatyvy ŭ Polščy, pieraniaŭšy hety karysny sposab ad niemcaŭ. Savieckija kooperatary taksama źviarnuli na jaho ŭvahu, ale sumniŭna, kab jon spatkaŭ tam šyrokaje raspaŭsiudžańnie dziela adsutnaści kooperatyŭnaj śviedamaści ŭ savieckaha hramadzianstva. —

Sabranaju hetkim sposabam sumaju ŭkładčyk moža rasparadžacca jak jon zachoča. Adnak, jak ahulnaje praviła, jana pierachodzić u kasu kooperatyvy, jak terminovy ŭkład.

Akramia „kapiłak“, u Niamieččynie raspaŭsiudžany jašče asobnyja marki, h. zv. *štolenmarki*, katoryja pradajucca kooperatyvami. Niamieckaja haspadynia ŭ bolšaści vypadkaŭ nie biare drobnuju reštu pry zakupie, ale kuplaje „štolenmarku“. Na śviata Kaladaŭ, ci inšaje, u jaje z „štolenmarak“ źbirajecca peŭnaja suma, katoraja i raschodujecca specyjal-

---

ты даравaў нам крыўду, якую мы табе зрабілі. Так неяк сталася... Мы ня ведалі... Думалі, што гэта цябе чорт скусіў...

Аляксей (*горка ўсьміхнуўшыся*): Чорт скусіў!... Хіба-ж я на такога выглядаю?!

II Селянін: Ня дзівіся, Аляксей. Калі-б ты яшчэ тады з суду да хаты вярнуўся, то можа-б мы іначай пра цябе думалі. А то ты некуды пайшоў і ўсякі казаў: «Калі-б ён ня быў вінаваты, то не ўцякаў-бы з вёскі!“ Але пасьля, калі выйшла праўда наверх, зразумелі, што цябе цяжка скрыўдзілі, пазналі, якая сьвятая для цябе справа — кооператыва. І нам сорамна, што мы не паверылі Рыгору і Насьці. (*Хвіліна маўчаньня*).

I Селянін: Я дык адразу хацеў ісьці да цябе, як толькі ты прыехаў. Бачыш, я шмат старэйшы за цябе, а хацеў пахіліць прад табой галаву і прасіць у цябе выбачэньня. Да дабра ты нас вёў, а мы табе вось як горка адудзячыліся.

Аляксей (*радасна*): Даражэнькія! Вашы словы напаўняюць маю душу шчасьцем. Дзякую вам, дзякую з шчырага сэрца, за тую радасьць, якую вы мне зрабілі. Яна ў сто разоў вынагарадзіла тыя думкі, якія я спазнаў. Ах, калі-б я мог яшчэ працаваць сярод вас! Чую, што для такіх грамадзян варта жыць і трудзіцца.

Марыся (*да I селяніна*): Дзядзька, чуеце, яму голас быццам зьмяніўся. Ад таго часу, як яго прывезьлі, ён ані разу так здарова не гаварыў, як цяпер.

I Селянін: Ня сумуй, будзе здаровы. Супакой — вялікі лек. Сам Бог яго творыць для сваіх выбраных. Бог міласэрны не забярэ нам яго. Я стары, няграматны, але бачу, што ўсьміхнецца доля нашаму народу, як будзе больш гэтакіх, як ён, Аляксей. Год толькі, як коопэратыва ў нас, а колькі прынясла добрых зьмен. Вось Янкель з сяла выбіраецца. Прасіў мяне, каб яму знайшоў купца на хату.

Аляксей (*хоча ўстаць, але Рыгор яго садзе назад на лаўку*): О, Божа, што я чую?! Няўжо-ж гэта ўсё праўда? Няўжо-ж гэта ня прыгожы сон... Буду здаровы, чую гэта. Чую, як мае грудзі ўзмацняюцца ў сілу і бярэць ахвота да жыцьця.

Марыся (*плача*): Божа, калі-б Іван дажыў да гэтага часу...

ЗЬЯВА 5.

Максім (*Абадраны, брудны паказваецца ў дзьвярах. Спачатку хоча вярнуцца назад, але пасьля нясьмела становіцца воддаль ад усіх*).

Усе (*зьдзіўлены*): Максім!!!

Аляксей (*глядзіць з дакорам у бок Максіма:*) Вярнуўся (*апускае галаву*).

na na pakupku śviatočnych pačastunkaŭ. A „pokul sud dy dzieła", kooperatyva i hetyja sumy trymaje na specyjalnym rachunku i puščaje ich u handlovy abarot. Isnuje jašče cety rad inšych sposabaŭ pryvablivańnia vyklučna drobnych aščadnaściaŭ, na što niamieckaja kooperacyja źviartaje samuju surjoznuju ŭvahu i što ŭ akančalnym razrachunku źjaŭlajecca pryčynaju jaje finansavaje mocy. Užo ciapier da 50% pajščykaŭ rehularna ŭnosić svaje drobnyja aščadnaści ŭ kooperatyvy. U Drezdenskaj kooperatyvie za adzin 1927 h. lik układčykaŭ uzros na 80%, u Lejpcyhskim — na 135%, u Hamburskim „Produktion'ie" za 1926 h. prybyło 20.000 novych układčykaŭ. Prytok układaŭ nahetulki pavialičyŭsia za apošnija hady, što značna pieravysiŭ patreby spažyvieckaj kooperacyi ŭ srodkach dla tavaraabarotu.

Kooperatyŭnaje budaŭnictva ŭ Niamieččynie moža słužyć dobrym prykładam dla ŭsich inšych narodaŭ. I nie darma tudy byli delehavany savieckija kooperatary, kab navučylisia, jak treba viaści kooperatyŭnuju spravu. Tym balej karysna ab hetym daviedacca biełaruskamu hramadzianstvu, biaručy pad uvahu toj sumny stan, u jakim znachodzicca kooperacyja na našych ziemlach.

(*Kaniec*).

A. F.

Сельская гаспадарка.

ПРАД ВЯСЬНЯНЫМ ВЫХАДАМ У ПОЛЕ

Перш чым сеяць ярыну, трэба дагледзіць азіміну. Зіма небясьпечна для азіміны і сваімі маразамі, і сьнягамі, і галаледзьдзем. Гэта апошняе асабліва важна сёлета з тае прычыны, што першая палова зімы доўга была бяссьнежнай, а маразы ціснулі даволі сільныя. — У чым істота гэтай небясьпекі?

Мароз сам сабой шкодны з таго, што ён можа непасрэдна вымаразіць няпрыкрытыя сьнегам засевы. Большая аднак ад гэтай непасрэднай небясьпекі марозу ёсьць небясьпека пасрэдная — чаргаваньне марозу з адлігай. Пры гэткім чаргаваньні самая ральля становіцца быццам жывой: пры змаражваньні падымаецца, а пры размаражваньні— апускаецца. Прычына гэтага ў тым, што змарожаная зямля, як вада ў бутэльцы, павялічвае сваё абыймо і, ня могучы расшырыцца ані ўніз, ані ўбакі, выпучваецца ўверх: як толькі мароз адпадзе, ральля прыймае свой першапачатны выгляд і асядае ўзноў наніз. Пры гэтым для засеваў дзеецца падвойная шкода: пры выпучваньні ральлі ўверх раз-

---

Насьця. Божа, які-ж бедны!

Марыся (*глядзіць то на Аляксея, то на Максіма*): Чаго ты йшчэ хочаш?

Максім (*падходзе бліжэй*): Марыся, ня бойся, я ня прышоў па тое, каб вы мяне прынялі назад. За вялікі мой грэх і за вялікая правіна, каб я мог спадзявацца прабачэньня. Няма для мяне сярод вас мейсца. Там, у сырых мурох вастрогу, пабачыў я сваю душу, як у люстры і плюнуў сам сабе у вочы. Цяпер з торбай на плячох пайду ў сьвет і можа адпакутую свой грэх (*разглядаецца, а пабачыўшы Аляксея на лаўцы, падае прад ім на калені*): Аляксейка! Гэты раз, гэты адзіны раз, пазволь мне назваць цябе сынам. Аляксейка, сынок! Даруй свайму айчыму хоць часьціну яго грахоў. (*Марыся і Насьця плачаць, рэшта апусьцілі галовы, Аляксей сядзіць і ня ведае што рабіць*).

Аляксей: Устаньце... Што вы!? Ня можна-ж так...

Максім: Не, ня ўстану, пакуль ты мне не даруеш. Я не хачу, як той Марка Пракляты, насіць грэх у сваёй торбе. Даруй мне, Аляксей, сынок! (*Зварочваецца да Марысі*): І ты мне, Марыся, выбач!

Аляксей: Я вам, тата, выбачаю. І мама і ўсе мы выбачым. Але вы ўстаньце. У нас сяньня гэткі радасны дзень...

Максім (*выцірае сьлёзы. Устае*): Я ня маю права цешыцца разам з вамі. Я нягодны гэтага. Мне ўжо лягчэй. Вось бачу: ты прыходзіш да здароў'я. Цяпер ня будзе мяне душыць камень вось тут (*паказвае на грудзі*), што я ня толькі злодзей, але й душагуб. Бывайце здаровы! І ты Аляксей... і ты Марыся... і вы ўсе, грамадзяне (*адходзіць*).

Аляксей: Тата, куды йдзіцё? Мама, вярнеце яго!

Марыся (*бяжыць за Максімам. Крычыць за кулісамі*): Максім, вярніся! Аляксей хоча, каб ты астаўся пры нас... (*праз хвіліну вяртаецца*): Не хацеў, толькі рукою махнуў.

Радзюк: Нічога, Марыся, няхай ідзе. Дараваны грэх—як завязаная рана: ня крывавіць, але часу трэба, каб выгаілася. (*Да Аляксея*): А ты, Аляксей, ня баўся, хутчэй здаравей і нас на вясельле прасі!

Рыгор (*весела*): А мяне ў дружбу!

Насьця: А мяне?!

Аляксей (*глядзіць па яе з любоў'ю*): А цябе?... за маю маладую, найдаражэйшую!...

Дзед Ахрэм (*выходзіць з-за хаты*): Вось так трэба было даўно зрабіць. А то вярцеў, вярцеў. Тое.. сёе... Але такі давярцеўся (*Усе сьмяюцца. Насьця кідаецца дзеду на шыю*).

Заслона.

КАНЕЦ.

рываюцца карэньні, а пры асяданьні — самая расьцінка „выцягваецца“ з ральлі наверх, асабліва, калі гэта падыманьне і асяданьне паўтараецца запарам некалькі разоў. Каб адратаваць гэтак паразрываныя і павыцягваныя расьцінкі-азіміны, іх трэба ўжо раньняй вясной прывалкаваць цяжкім гладкім валам. У добрыя часы гэтак загрожаныя засевы йшчэ падгнойваюцца лёгка даступным азотным угнаеньнем, як салетра, азотняк...

Небясьпечны для азімых засеваў і сьнежныя засыпы, а таксама лёд і вада. — Сам сьнег, калі ён залежыцца да пазна, звычайна з верху ўжо абледзянее і не дапускае ўніз паветра, патрэбнага расьціне да дыханьня. Ад гэтага засевы даслоўна душацца і прападаюць. Калі-ж не наступіць задушэньне, дык усёроўна пад сьнежнай пакрывай вытвараюцца ідэальныя варункі—цёпла, вогка— для росту **сьнежнай плесьні**, якая губіць засевы яшчэ горш, чым адапрэньне, калі толькі сяўба ня была байцавана. Гэтасамая небясьпека пагражае азімым засевам пад лёдам, ці зьледавацелым сьнегам, — асабліва, калі прыгрэе вясьнянае сонца.

Ратаваньне засеваў з пад сьнежных ці ледзяных пакрываў, у аснове сваёй, вымагае зьняцьця гэтае пакрывы. Тэхнічна аднак гэта немагчыма, а практыка паказала, што хапае самае толькі раскрышэньне верхняга зьледзянелага пласту: рэшту дакончыць ужо сам вецер, дождж і сонца. Для раскрышэньня-ж верхняга пласту пры малой плошчы хапае ужыць рыдлёўкі. Пры большых засьнежаных плошчах ўжываюцца на сьнег вострыя жалезныя бароны: сьнег разбароньваецца.

Урэшце вада з сьнежных і ледзяных растопаў пагражае вымаканьнем: гэткую ваду трэба як найхутчэй спускаць.

Калі азіміна выйдзе на вясну занадта густая, яе трэба баранаваць, асабліва пшаніцу; з баранаваньнем жыта трэба быць асьцярожным, бо яно да гэтай пары можа ўжо закусьціцца. Канюшыну вясной трэба заўсяды баранаваць, каб выбраць стуль старыя астаткі і даць доступ паветру і сьвятлу. Пры мейсцы трэба ўспомніць аб небясьпецы ракавіны ў канюшыны: пазнаецца яна па тым, што зарост вельмі рэдкі, самыя расьцінкі вельмі лёгка даюцца выцягнуць з зямлі — корань адапрэўшы і на ім знаходзяцца чорныя струпы, вялічынёй з гарошыну. Ракавінай нападзеную канюшыну адратаваць ня можна: яе трэба заараць і на гэтым полі праз 7 год ня сеяць ніякай матыльковай расьціны, як лубін, гарох, сачыўка і г. д.

—ч.

Вясной у садку.

Апошні ўжо срок сабраць з дрэваў старыя засохшыя лісты, а мясцамі затрыманыя нават і яблыкі. Паабчышчаць трэба мох, суччо, пазразаць вострым нажом „ваўкі“ і нагул лішнія галінкі, якія замінаюць доступу сонца і паветра і забіраюць дарагія, жыцьцядайныя сокі. Праз кару дрэва дыхае, але кара мусіць быць чыстай. Дзеля гэтага старую кару, разам з мохам, трэба абскрабаць: у іх трымаецца да таго яшчэ і шмат шкоднікаў. Абскрабанае дрэва беляць вапнай з сінім каменям. Усё ськівенае з дрэва трэба старанна сабраць і спаліць. Тое што ня ўдасца сабраць чалавеку самому, мусяць дакончыць куры.

Бараніцца трэба вясной у садку і ад прымаразкаў, якія асабліва шкодны, калі дрэва ў цьвеце: белыя ці ружовыя покаўкі ад марозу за ноч пачарнеюць і цэлы ўраджай страчаны. Каб усьцерагчыся шкодаў ад гэткіх прымаразкаў, раскладаюцца ў садку гэтак званыя дымныя і агнёвыя кучы, якія ў разе патрэбы на нач запальваюцца: дым падымаецца ўверх і бароніць цьвет ад марозу. Калі б паветра стаяла спакойнае і дым толькі рассьцілаўся пры зямлі, тады распальваюць сярод дымных куч кучы агнёвыя. ад агню паўстае кругаварот паветра і дым тады падымаецца ўверх.

Дымныя кучы прыгатаўляюцца больш-менш гэтак: убіваецца ў зямлю грубы кол, каля кала кладзецца пласт сухой саломы, пасьля—вогкі саломісты гной, перамешаны з лісьцём, торфам ці саломай, пасьля кладзецца пласт рознага, напалову вогкага сьмяцьця, яловых лапак, лясных калючак і ўрэшце—зямлі. Добрым таксама дымным матэрыялам ёсьць канапляная кастра, мох, торф, сухі конскі гной і г. п. Запальваецца гэткая куча ад саломы. Куча ад кучы кладзецца на адлегласьці 10—15 мэтраў. — На агнёвыя кучы ужываецца матэрыял больш гаручы, напр. сухі хруст.

Усялякія — дымныя і агнёвыя—кучы, калі яны запалены, трэба праз ноч вартаваць. У праціўным разе дымныя тучы могуць заняцца агнём, а агнёвыя могуць пашкодзіць самому дрэву. Агнёвыя кучы ня можна класьці бліжэй як 20 мэтраў ад дрэва.

Б. Гал.



— Тым, хто не аднавіў падпіскі, высылка „Самапомачы“ ўстрымана. — Тым, хто мае падпіску ўрэгуляваную, далучаем нумары „Самапомачы“ дзеля прапаганды: кожны падпішчык мусіць пастарацца здабыць хоць аднаго прыхільніка кооперытыўнай „Самапомачы“!

Раньнія куры.

Кажуць, што курыца-марцоўка з усіх найлепшая. Але ў нашым сьцюдзёным клімаце хопіць на гэта і курыца на месяц пазьнейшая. Раньняя курыца тым добрая, што нясецца ў першую ўжо восень і ў пару дае курчачы тавар: чым раней увосені прыдзе на рынак яйко і курчанё, тым лепшую дасягне цану. Як адно, так і другое падказвае садзіць курыцу на яйкі як найраней, па магчымасьці не пазьней канца м-ца красавіка(IV).

Гэта аднак напатыкае на некаторыя труднасьці; між іншым у гэтым часе цяжка знайсьці добрую курыцу-квактуху. Труднасьць гэту ў паасобных гаспадарках можна тым абыйсьці, што замест кур ыцы бярэцца індычка, якую прад тым прывучаюць сядзець: пару дзён трымаюць яе накрытай ў гнязьдзе з штучнымі яйкамі (або і бяз іх), пазваляю чы ёй сысьці з гнязда на пару хвілін, каб наесьціся і напіцца.

Калі індычка ўжо расседзіцца, тады падкладаюць ёй яйкі, загадзя выбраныя ці то ад курэй свайго собскага гадаваньня, ці то куп леныя, ці выменяныя. У разе куплі яек здалёку, трэба абавязкава парадзіцца з чалавекам абазнаным, бо нічога лягчэйшага, як гэткім чынам выдаць грошы і нічога за іх ня мець. Пры выбіраньні яёк ад сваіх курэй трэба кіравацца гэтымі правіламі:

1. браць яйкі ад добрых, найлепш ад двугадовых курэй;

2. само яйко мусіць быць сярэдняй вялікасьці, з моцнай і гладкай луской і не старэйшае двух тыдняў;

3. гняздо мусіць быць у зацішным месцы, а яйкі ў ім трэба гэтак разлажыць, каб іх добра абхоплівала насаджаная квактуха і каб яны не ляжалі ў кучы, а толькі ў адзін пласт (адно пры другім);

4. калі памешканьне, у якім насаджваецца квактуха, вельмі сухое, тады ў гняздо пад салому кладуць пласт дзярна, травой уніз;

5. каля гнязда трэба паставіць скрынку з пяском і попелам, каб курыцца магла „купацца:“ чысьціцца ад вашэй і іншай шкоднай жамяры;

6. самую квактуху прад насаджваньнем трэба абгледзіць, каб яна была чыстая ад вашэй і ня мела вапенных ног. Прад дальшым зьвашывеньнем абараняецца курыца тым, што яе прад насаджваньнем перасыпаюць табачным парашком.

Х. Ш.

Паведамляйце дакладна, на каторай пошце і чаму гінуць недаручаныя нумары „Самапомачы“ (паводле „Увагі“ на 2-й бачыне вокладкі, унізе).

Раньняя бульба.

Каб мець ранную бульбу на пракармленьне, а нават і на продаж, не канешна патрэбны дарагія прылады: хапае для гэтага крыха добрай волі, застасаванай у адпаведным часе.

Ужо ў м-цы сакавіку (III) выбіраюцца здаровыя, сярэдне-вялікія бульбіны раньніх сартоў, з вочкамі выразна зазначанымі і раскладаюцца па аднэй на прыцьмяных паліцах, у цёплых, ня сусём сухіх памешканьнях, найлепш — у цёплых хлявох. Паліцы прымацоўвуюцца да сьцен, або яшчэ лепш— да столі. Гэтак разложаныя бульбіны пачынаюць хутка прарастаць і да часу, калі зямля на градцы досыць выгрэецца,расткі дасягаюць удоўжкі ўжо 4—5 цаляў (далонь). Прарошчаную бульбу асьцярожна садзяць у ямкі ручна выкапаныя так, каб расткі падыходзілі пад сам верх засыпыванай зямлі.

Гэтак паступаючы можна лёгка мець бульбу на 2—3 тыдні ранейшую, што ў бедных асабліва гаспадарках мае вялікае значэньне.

Г. Р.

ЯК ВЫБІРАЦЬ ДОБРАЕ МЫЛА?

1. Добрае мыла мае на сабе выразную назову фірмы, а на апакоўцы — і месца, дзе яно вырабляецца;

2. пры паціраньні мыла вогкім пальцам, мусіць паўстаць густая пена;

3. на мыле не павінна быць выступіўшая белая павалока (гэтак званы „мароз“), бо гэта было-б адзнакай завялікай дамешкі соды;

4. на мыле не павінна быць трэшчынаў, бо гэта азначала-б, што на прыгатаваньне мыла было ўжыта малавартасных матэрыялаў;

5. добрае мыла ня сьмее паляжаўшы некалькі дзён карчыцца: у праціўным выпадку гэта азначала-б, што да яго — для вагі — было дадана г. зв. шкляной вады.

Гаспадарчая хроніка.

Земляробская Палата. Перадусім справа не аб палацы, а аб палаце (папольску „Izba“), г. зн. не аб будынку, а аб установе, складзенай з людзей назначаных і выбіраных, калі сяньня аб „выбарах“ наагул можа быць мова. Пяць гадоў таму назад (22.III.1928 г.) быў выданы закон аб Земляробскіх Палатах у Польшчы. Меў ён датычыць і нашага краю. Да гэтага аднак не дайшло: утварылася паводле гэнага закону адна толькі Земляробская Палата, у Варшаве, ды і тая не апраўдала ўскладаных на яе спадзяваньняў, бо без пары паміраючы пакінула па сабе ў спадчыне аж некалькі сотняў тысяч даўгоў, не рахуючы ня меншых выдаткаў на яе аплачаных з скарбовых касаў.

Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ.

Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 6–10.

Незавідны лёс Варшаўскай Палаты быў, відаць, прычынай таго, што пад канец м-ца кастрычніка м. г. быў зьменены сам закон аб Палатах. Апошнія-ж весткі наказваюць, што на дзень 27 г. м. (панядзелак) назначаны ўжо выбары ў **Віленскую** Палату, якая мае абымаць ня толькі Віленшчыну, але і Навагрудчыну.

Спадзявацца, каб гэтыя „выбары“ і сама Палата ўнясьлі нешта новае ў наша гаспадарчае жыцьцё, — ня прыходзіцца. Дадаць жыцьця нашай гаспадарцы зможа толькі чыньнік грамадзкі. Палата-ж гэтага ня ўносіць, але замарожвае і тое, што ў гэтым кірунку ўжо існуе.

Для самога земляробства існаваньне Палаты (замест дагэтуляшніх „кулкаў“) зазначыцца насамперш тым, што да звычайных падаткаў, далучыцца йшчэ падатак на Палату, бо належаць да яе кожны земляроб, хоча ці ня хоча, усё роўна мусіць.

Вываз зёлак лякарскіх за апошні год значна павялічыўся. На нашых палёх і сенажацях часта ня родзіць збожжа, але зёлак усялякіх поўна. Зьбіраньне-ж гэтых зёлак дае выгодны зыск. Дык ня трэба „спаць у шапку“.

ЦЭНЫ Ў ВІЛЬНІ

Паводле нотаваньняў Віленскай збожжова-таварнай і льнярскай бурсы з 1 да 13.III.33 г. за 100 кілё; тавар сярэдняй якасьці

Жыта мяшанае—ад 2[illegible].00 да 20.50 зл.; пшаніца мяшаная ад 34.00 да 31.00; ячмень на пансак—18.00; авёс 15.00; мука жытняя 55 прац. ад 35.00 да 33.00 зл.; мука жытняя 65 прац. ад 31.00 да 28.00 зл.; мука разовая — 24.00 зл.; мука пшонная 0000 ад 58.00 да 55.00 зл.; крупы грэчныя 1/1 паленыя — 45.00; пансак ячменны — 35.00 зл.; жытнія вотрубы і пшанічныя — 12.00 зл.; грэчка — 21.50 зл.; фасоля белая — 23.00 зл.; лён трапаны друйскі (за 1000 кілё)—1039.20 зл.; лён трапаны валожынскі — 1212.40 зл.; льнянае семя 95 прац. — ад 40.00 да 36.00 зл..

Макухі (на Курляндзкай алеярні): за 100 кілё льняных — 22.00 зл., сланэчнікавых — 17.00 Зл..

Малочнае (паводле нотаваньняў Віленскага малачарскага саюзу з 13.III.33 г.: масла найлепшае за 1 кілё ў гурце ад 3.50 да 3.60 зл., у дэталю ад 4.00 да — зл.; масла сталовае у гурце ад 3.30 да 3.40 зл., у дэталю ад 3.70 да — зл.; масла солёнае ў гурце ад 2.90 да 3.00 зл., у дэталю ад 3.20 да 3.30 зл.; сыры з тварагу за кілё у гурце — зл., у дэталю — — зл.; сыры літоўскія за кілё ў гурце ад 2.20—2.60, у дэталю ад 2.40 да 3.00 зл.; яйкі за капу ад 4.20 да 6.30 зл., за штуку ад 8 да 13 гр..

Мяса (на Віленскай гарадзкой бойні) за кілё гавяды (валовіна) за кілё бітай вагі: ад 1.00 да 1.05, сьвініна ад 1.45 да 1.50 зл..

Воўна (у Беластоку дн. 9.III.1933 г.) краёвая, напалову мытая, за кілё гуртам 2.75—2.85 зл.

Цэгла паводле нотаваньняў „Цэнтроцэглы“ за 1000 штук будаўлянай цэглы, з дастаўкай на месца будовы (у Вільні) — 68.00 зл..

Pierasyłka apłačana ryčałtam.

